Канстытуцыя. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў панядзелак адкрыецца выстаўка рарытэтаў з Беларусі і Латвіі «Праобраз еўрапейскай Канстытуцыі», прымеркаваная да Дня Канстытуцыі. Арганізатары — Нацыянальная бібліятэка Беларусі пры ўдзеле Пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвійскай Рэспубліцы і Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта. На выстаўцы ўпершыню шырокай публіцы будзе прадстаўлены амаль нікому не вядомы спіс Статута ВКЛ 1588 г. у перакладзе на нямецкую мову пачатку XVIII ст. са збору адной з найстарэйшых бібліятэк Еўропы — Акадэмічнай бібліятэкі Латвійскага ўніверсітэта. Таксама можна будзе пабачыць друкаваныя асобнікі Статута XVII—XIX стст. з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на іншых еўрапейскіх мовах, якія сведчаць пра шырокі ўплыў беларускай прававой культуры на фарміраванне міжнароднага канстытуцыйнага заканадаўства.